# Камандны падыход




Фота Таццяны БОНДАРАВАЙ.

Пра падрыхтоўку будучых інжынераў, прафесійны выбар і школьную робататэхніку — у інтэрв'ю з настаўніцай фізікі сярэдняй школы № 1 Новалукомля імя Ф.Ф.Дуброўскага Вольгай Бауфалік.

►►► 5 стар.

◄◄◄ 1 стар.

# Камандны падыход

Аднойчы на курсах у ВАІРА Вольга Бауфалік сустрэла настаўніцу фізікі з Крулеўшчынскай сярэдняй школы Докшыцкага раёна імя І.П.Ціткова, па прыкладзе якой у свой час выбрала прафесію. Сярод заданняў для слухачоў была самапрэзентацыя. Падчас яе Таццяна Малчанава з гордасцю прадставіла сваю вучаніцу: "Маё высокае дасягненне сядзіць побач са мной у гэтай аўдыторыі". У нашай размове Вольга Яўгенаўна агучыла сваю настаўніцкую мару: "Буду шчаслівая, калі ў пэўны момант змагу сказаць тое ж самае пра свайго вучня".

**— Год стартаваў дынамічна і пазітыўна: вы атрымалі вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю, ваш вучань Даніла Зейдзін стаў удзельнікам лютаўскай змены ў Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку… Як, дарэчы, яго ўражанні?**

— Мы арыентуемся на працяг. Даніла нацэлены прайсці яшчэ і дыстанцыйнае навучанне, будзем падаваць дакументы на вераснёўскую змену. Інтэнсіў у дзіцячым тэхнапарку дапамог убачыць ключавыя моманты, якія трэба дапрацаваць, каб набыць неабходныя для гэтага ўзроўню работы веды. Заўсёды імкнуся сфарміраваць у вучняў сістэмны падыход, калі поспех не самамэта, а матывацыя, імпульс да развіцця. Вобразна кажучы, смак заслужанай перамогі з пікантнай гарчынкай незадаволенасці — гэта нармальна, бо стымулюе рухацца далей. У Данілы я з 5 класа вяла матэматыку, у 6 класе на абласной алімпіядзе ён узяў дыплом І ступені. Паступова хлопца ўсё больш захапляў інжынерны напрамак. Таму са мной вучань з 7 класа пачаў паглыблена займацца фізікай, бо я поўнасцю пераключылася на любімы прадмет. Плюс з маімі калегамі Ларысай Ліцвінавай і Ліліяй Мамойка ён займаецца матэматыкай і інфарматыкай. На абласных этапах рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах у 8 класе Даніла заваяваў дыплом ІІІ ступені па матэматыцы, у 9 класе — такі ж па фізіцы. Неаднойчы перамагаў і ўваходзіў у склад прызёраў розных спаборніцтваў па інфарматыцы, праграмаванні і робататэхніцы. Напрыклад, у яго скарбонцы — 3-е месца ў кампетэнцыі "Прататыпаванне" адкрытага ІТ-чэмпіянату "РобІн" на базе Нацыянальнага дзіцячага адукацыйна-аздараўленчага цэнтра "Зубраня".

**— А як поспехі сёлета?**

— Прадказальны рост. Акрамя дэбюту ў дзіцячым тэхнапарку, хлопцу ўдалося прайсці на абласны этап рэспубліканскай алімпіяды адразу па фізіцы і матэматыцы. Мы з калегамі абмеркавалі сітуацыю і параілі вучню выбраць матэматыку, бо ў мяне напярэдадзе была атэстацыя, Ларыса Леанідаўна мела большы рэсурс часу на яго падрыхтоўку. Гэта было правільнае рашэнне: юнак павысіў ранейшы вынік на вобласці і ўдзельнічае ў фінале алімпіяды.

**— Магчыма, эфектыўней было б сканцэнтравацца на адным прадмеце? У вашым педагагічным трыа не ўзнікае саперніцтва за таленавітага вучня?**

— Не ўзнікае. Даніла — не адзіная наша яркая зорачка. На рахунку вучняў школы нямала выдатных поспехаў, уключаючы перамогі міжнароднага ўзроўню. Двойчы за пяцігодку з рознымі навучэнцамі заваяваць залатыя медалі Сусветнага конкурсу вынаходстваў World Invention Competition And Exhibition, фактычна кожны сезон выходзіць у фінал "100 ідэй для Беларусі" — як вам планка? Зусім нядаўна дзяўчынка-пяцікласніца перамагла на XXVII абласной навукова-практычнай канферэнцыі "Квант" і толькі па ўзросце не змагла ўдзельнічаць далей — у XIV Рэспубліканскім конкурсе "ТэхнаІнтэлект". Падобныя вынікі, дасягнутыя вучнямі пад кіраўніцтвам калег, не могуць не натхняць. Прытым што мы нават не школа ў райцэнтры… Вопыт нашай установы адукацыі сведчыць, што зладжанае каманднае ўзаемадзеянне настаўнікаў дае аптымальны эфект у адносінах да ўсіх без выключэння вучняў. Калі ж гаворка ідзе пра адоранае дзіця, то ніхто з нас не будзе старацца "перацягнуць" яго да сябе, нібы канат. Мы дружна становімся ўздоўж гэтага ўяўнага каната за плячыма вучня, бацькоў завём на дапамогу ды цягнем у адзін бок — адсюль і выніковасць. Спецыялізацыя — гэта пра каледж або ўніверсітэт.



> У школе для фарміравання будучага прафесіянала важна закласці грунтоўную базу па ўсіх профільных прадметах, а таксама паказаць магчымасці, якія вучань самастойна можа не ўбачыць з-за недахопу жыццёвага вопыту. Такіх прыкладаў нямала.

**— Падзяліцеся?**

— Наша школа мае дастаткова моцную матэрыяльна-тэхнічную базу, якая штогод удасканальваецца. І ўсё ж з магутнасцямі ўніверсітэтаў, устаноў адукацыі рэспубліканскага ўзроўню яе, зразумела, не параўнаць. Разам з тым хочацца самім знаёміцца і знаёміць вучняў з сучаснымі тэхналогіямі, эксперыментаваць на найноўшым абсталяванні. Цяпер у значнай меры вырашэнне гэтых задач ускладзена на Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк. Рада, што мы праклалі туды сцежку, але хачу сказаць, што аналагічныя траекторыі развіцця мы знаходзілі і раней. Так, мае калегі Лідзія Краўцова, услед за ёй Лілія Мамойка пры падтрымцы кіраўніцтва школы наладзілі цесныя сувязі з Рэспубліканскім цэнтрам экалогіі і краязнаўства. Сумесна выбудавалі эфектыўную адукацыйную мадэль: нашы школьнікі штотыднёва праводзяць даследаванні ў сталічнай лабараторыі пад кіраўніцтвам Івана Рускіх. Залатыя перамогі на WICE ў Малайзіі — плён гэтага партнёрства. Мы былі актыўна задзейнічаны ў інавацыйным праекце "Укараненне мадэлі фарміравання культуры навучэнцаў у сферы энергетыкі ва ўмовах сеткавага ўзаемадзеяння ўстаноў адукацыі". Праз школьны рэсурсны цэнтр "Энергазберажэнне — пачні з сябе" наша ініцыятыўная група наладзіла работу з філіялам "ЭкаТэхнаПарк-Волма" РІПА. Між іншым з усіх школьных настаўнікаў краіны толькі мы з калегай Ірынай Марціновіч доўгі час былі адзінымі, хто па выніках падрыхтоўкі атрымаў правы займацца і праводзіць заняткі ў "Волме". Супрацоўнічаем з ПДУ імя Еўфрасінні Полацкай. Вельмі цікава прайшлі заняткі ў прасторы па інтарэсах тэхнічнага профілю "Інжынер будучыні". Прыемна, што мы былі ў ліку трох школ Віцебшчыны, якія ўдзельнічалі ў старце гэтай ініцыятывы ва ўніверсітэце.

**— Вашы выпускнікі часта выбіраюць інжынерныя спецыяльнасці?**

— Новалукомль — малады горад энергетыкаў. Інжынерныя спецыяльнасці, асабліва звязаныя з энергетычнай сферай, традыцыйна прывабліваюць моладзь, што мы заўсёды стараемся падтрымаць і заахвоціць. Робім гэта дастаткова эфектыўна, на маю думку. Нездарма тры гады назад, калі ў краіне пачала ажыццяўляцца ідэя па стварэнні класаў і груп інжынернай накіраванасці, прызначаны для Чашніччыны комплект робататэхнічнага абсталявання "РОББО" накіравалі менавіта ў нашу школу. Тут мы таксама ля вытокаў навацыі ў раёне, а мяне назначылі адказнай за гэты напрамак. У 10 класе ў нас працуе інжынерная група, вяду ў ёй факультатыў. Яшчэ я кірую школьным метадычным аб'яднаннем настаўнікаў матэматыкі, інфарматыкі і фізікі. Безумоўна, мы падтрымліваем цесны кантакт з філіялам "Лукомская ДРЭС" УП "Віцебскэнерга". Прывяду характэрны прыклад. Звычайная экскурсія для навучэнцаў па прадпрыемстве доўжыцца 20—30 мінут,

> *Новалукомль — малады горад энергетыкаў. Інжынерныя спецыяльнасці, асабліва звязаныя з энергетычнай сферай, традыцыйна прывабліваюць моладзь, што мы заўсёды стараемся падтрымаць і заахвоціць.*

мы ж у студзені прабылі там больш за дзве гадзіны, але дзецям і таго здавалася мала: настолькі было цікава! Адна справа, калі ты чытаеш пра спецыяльнасць, і зусім іншая — калі можаш даведацца пра яе з першых вуснаў у вытворчым цэху, прымерыць на сябе і літаральна памацаць. Гэта, напэўна, самая эфектыўная прафарыентацыя. Калі казаць канкрэтна пра маіх вучняў, то возьмем хаця б леташні выпуск, трэцюю па ліку маю групу фізіка-матэматычнага профілю. Усе паступілі ў беларускія ўніверсітэты, сярод якіх ПДУ імя Еўфрасінні Полацкай, ВДТУ, ВДУ імя П.М.Машэрава, БНТУ, БДУІР. Амаль усе выбралі інжынерныя спецыяльнасці, за выключэннем адной дзяўчыны: яе рашэнне стаць настаўніцай мяне таксама парадавала.

**— Хто вас натхніў пайсці настаўніцкім шляхам? Ці даўно працуеце ў гэтай школе?**

— Мяне натхнілі любімыя настаўнікі і бабуля з дзядулем па мацярынскай лініі: яны абое мелі інжынерныя спецыяльнасці і матэматычны склад розуму. У прынцыпе, класічны сюжэт пераемнасці пакаленняў. Пасля школы я паступіла ў ВДУ імя П.М.Машэрава. На тым жа факультэце закахалася ў студэнта, на год за мяне старэйшага. Мы зразумелі, што далей хочам ісці па жыцці разам, стварылі студэнцкую сям'ю.

У гэтую школу мяне размеркавалі па месцы работы мужа. Ён без малога дзесяць гадоў аддаў педагагічнай дзейнасці. Працаваў настаўнікам, дырэктарам адной з вясковых школ нашага раёна. Аднак паступова інжынерна-тэхнічныя схільнасці пераважылі над педагагічнымі: муж змяніў прафесійную сферу і, як паказаў час, паспяхова. Між тым я шаснаццаты год застаюся на сваім першым рабочым месцы і пра іншае не думаю. У гэтай жа школе вучацца нашы дзеці: дачка ў 10 класе, у маёй інжынернай групе, а сын — шасцікласнік, захапляецца робататэхнікай. Спадзяюся, што яны працягнуць прафесійную дынастыю. Будзе гэта інжынерны напрамак або школьны фізмат — час пакажа.

**Таццяна БОНДАРАВА.**
**Фота аўтара.**